Вусна пракаменціруйце правапіс слоў з прапушчанымі літарамі.

Размясціце пункты плана тэксту ў правільнай паслядоўнасці.

П л а н

1. Соніна градка.
2. Прыезд на лецішча.
3. Новы клопат.
4. Пасадка радыскі.
5. Яблыневы сад.

Спішыце частку тэксту, якая адпавядае пункту плана «Яблыневы сад». Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары. Растлумачце правапіс суфіксаў прыметнікаў.

**331.** Размяркуйце прыметнікі па групах у залежнасці ад таго, якому правілу падпарадкоўваецца іх правапіс. Запішыце.

Чысценькі, задуменны, снежаньскі, вузенькі, выдавецкі, здаравенны, восеньскі, вогненны, баранавіцкі, светленькі, юнацкі.

Сфармулюйце правіла правапісу прыметнікаў кожнай групы.

**332.** Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Правапіс ***-н-, -нн-*** у прыметніках».

## § 53. Складаны план

!

План тэксту можа быць як простым, так і складаным. У складаным плане асобныя пункты маюць падпункты. Гэта адбываецца, калі ў тэксце выдзяляюць вялікую частку, якая ўключае некалькі малых частак.

Пункты складанага плана, як і простага, могуць мець форму словазлучэнняў, кароткіх апавядальных або пытальных сказаў.

**333.** Прачытайце тэкст. Растлумачце сэнс загалоўка.

### Пазнаёміліся

У кожнага быў свой занятак. Жанчына з маленькім сынам акучвала бульбу. А шпачыха збірала побач чарвякоў і насіла іх пісклявым птушанятам.

Раптам адно шпачанё рванулася насустрач маці і выпала са шпакоўні. Неслух распластаў крылы і бездапаможна павіс на кусце бульбяніку.

— Ах ты, гора маё! — разагнула спіну жанчына.

Яна адшукала драбіны*, прыставіла іх да яблыні, сунула за пазуху птушанё і палезла да шпакоўні. Шпачыха ў гэты час сядзела з чарвяком у дзюбе на доміку. Выцягнула шыю і лапкамі ад нецярпення перабірае. Нарэшце жанчына пасадзіла жаўтароціка ў шпакоўню.

Шпачыха скокнула ў домік. Сунула неслуху чарвяка, ушчыкнула і прыкрыла крылом. Паназірала жанчына за шпачыхай, уздыхнула і даверліва, нібы з суседкай, падзялілася мацярынскай думкай:

— Усе яны, падшыванцы*, аднолькавыя!

А сынок стаіць унізе, назірае і шчасліва ўсміхаецца. Ён вельмі рады, што маці ўратавала шпачынага «падшыванца» *(Паводле П. Саковіча)*.

Пазнаёмцеся са складаным планам тэксту.

П л а н

1. У кожнага свой занятак.
2. Шпачанё ў небяспецы.
3. Вырataванне неслуха.
   а) Добры ўчынак жанчыны.
   б) Хваляванне шпачыхі.
4. Даверлівая размова.
5. Радасць сына.



Прачытайце часткі тэксту, якія адпавядаюць кожнаму пункту плана.

Якія словы выкарыстоўвае аўтар, каб пазбегнуць паўтарэння назоўніка *шпачанё*?

З дапамогай тлумачальнага слоўніка растлумачце значэнне слова *падшыванец*. У якіх стылях маўлення яно можа ўжывацца? Якое значэнне набывае гэта слова ў тэксце?

Вусна перакажыце тэкст па плане, дапоўніўшы яго апісаннем шпачаняці. Выкарыстайце прыметнікі з суфіксамі ацэнкі.

Д л я д а в е д к і: *шэрае пер’е, светлая грудка, кароткія крыльцы і хвосцік, вялікая жоўтая дзюба.*



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**334.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Якія тыпы маўлення спалучаюцца ў тэксце?

### Як Глаша выратавала Гошу

Жыў у Андрэйкі папугай Гоша. Такі прыгажун! Пярынкі бірузовыя, бліскучыя, галоўка жоўценькая. Доўгі хвост пераліваўся рознымі колерамі. Гоша ведаў шмат слоў, і яго загнутая кручком дзюбка амаль не змаўкала.

Сядзець у клетцы папугай не любіў. Цэлымі днямі лётаў гарэза па кватэры і выкрыкваў:

— Гоша прыгожы! Гоша разумны!

Быў у хлопчыка яшчэ кот Макс. Ён цярпець не мог папугая. Гоша гэта ведаў і пабойваўся ката.

На дзень нараджэння Андрэйку падарылі канарэйку. Побач з клеткай Гошы паставілі клетку Глашы. Не спадабалася папугаю новая суседка. Надзьмуўся ён і нават гаварыць не хацеў. А Глаша спявала і не звяртала ўвагі на ганарыстага папугая.

Засталіся аднойчы Андрэйкавы выхаванцы адны ў кватэры. Гоша сеў на спінку крэсла, стаў чысціць пярынкі. Тут кот і схапіў яго. Гоша пачаў крычаць. Канарэйка спалохалася, заскакала па клетцы, паспрабавала адчыніць дзверцы. Прасунула маленькае крылца праз шчылінку, пачала здымаць кручок.

Знясілены папугай ужо ледзь дыхаў у лапах Макса. І раптам нехта дзеўбануў ката ў лоб! Макс завішчаў, аслабіў кіпцюры. Тут Гоша і вырваўся. Падляцеў паскубаны папугай да сваёй выратавальніцы Глашы, апусціў галоўку, стаў кланяцца.

З таго часу папугай і канарэйка сябруюць. Гоша нешта расказвае Глашы, а яна песні спявае *(Паводле Г. Скаржынскай)*.

Складзіце складаны план тэксту. Вызначце 2-3 апорныя словы (словазлучэнні), якія адпавядаюць кожнаму пункту плана. Перанясіце табліцу ў сшытак і запоўніце яе:

| План тэксту | Апорныя словы |
|---|---|
| | |

Пісьмова перакажыце частку тэксту, якой адпавядае пункт плана з падпунктамі.